ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (1044) ● ЧАЦВЕР, 7 сакавіка 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

**Заўтра універсітэцкі калектыў разам з усім савецкім народам адзначыць цудоўнае вясновае свята — Міжнародны жаночы дзень.**

**Але ўжо сёння нашы добрасумленныя працаўніцы, пяшчотныя маці, цудоўныя сяброўкі — выкладчыцы, супрацоўніцы, студэнткі атрымаюць шмат шчырых віншаванняў, падарункаў, кветак у знак павагі і любві.**

**Са святам, дарагія жанчыны! Няхай ва ўсім вам шчасціць!**

## ДА НОВЫХ ПОСПЕХАЎ!

НА МІНУЛЫМ тыдні адбыўся агульнауніверсітэцкі партыйны сход, на якім з дакладам «Аб выніках снежаньскага (1973) Пленума ЦК КПСС, XII пленума ЦК КПБ і задачах партыйнай арганізацыі універсітэта» выступіў прарэктар БДУ У. С. Багданаў.

У дакладзе быў зроблен аналіз поспехаў, якія былі дасягнуты ў мінулым годзе ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве, прыведзены цікавыя лічбы, што характарызуюць развіццё розных галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі, стан і рэзервы машынабудавання, хімічнай, нафтавай, лёгкай прамысловасці, электраэнергетыкі і г. д.

Сказана было і пра тыя недахопы, што замінаюць інтэнсіфікацыі вытворчасці, стрымліваюць рост прадукцыйнасці працы, уплываюць на якасць прадукцыі.

Дакладчык напомніў рубяжы, вызначаныя пленумам ЦК КПБ, якія павінны ўзяць працоўныя рэспублікі па росту аб'ёму вытворчасці, прадукцыйнасці працы, павышэнню ураджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадукцыйнасці жывёлагадоўлі.

Пленум ЦК КПБ паставіў задачу завяршыць выкананне пяцігадовага плана па агульнаму аб'ёму прамысловай вытворчасці за чатыры гады і восем месяцаў і забяспечыць за пяцігодку прырост прадукцыі на 62—64 працэнты.

Працаўнікі прамысловасці Мінскай вобласці абавязаліся па асноўных паказчыках выканаць пяцігодку за 4,5 года.

Значная частка даклада была прысвечана знешняй палітыцы нашай краіны.

Як падкрэсліў дакладчык, рашэнні снежаньскага (1973) Пленума ЦК КПСС маюць важнейшае значэнне для партыі, усяго савецкага народа, у тым ліку і для партарганізацыі і ўсяго калектыву БДУ. Яго галоўная задача — удасканаленне вучэбна - выхаваўчага працэсу з мэтай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, спецыялістаў заўтрашняга дня.

Асноўны паказчык работы калектыву БДУ — вынікі сесіі. Паспяховасць студэнтаў дзённай формы навучання ў мінулую сесію склала 93,1 працэнта, што на 1 працэнт вышэй мінулагодняга паказчыка. Здавалі экзамены 9.037 студэнтаў і атрымалі адзнакі: выдатна — 1.246 чалавек (13,8 працэнта), выдатна, добра і толькі добра — 4.122 (45,5 працэнта), змешаныя адзнакі — 2.809 (31 працэнт), толькі здавальняюча — 256 (2,8 працэнта), нездавальняюча — 604 (6,9 працэнта).

Высокія вынікі паспяховасці маюць факультэты: юрыдычны (97,6 працэнта), журналістыкі (97,4), гістарычны (97,2). Ніжэй сярэдняй па універсітэту склалася паспяховасць на геаграфічным факультэце (91,9), ФПМ (91,2), матэматычным (90,0).

У параўнанні з зімовай сесіяй мінулага навучальнага года павысілася паспяховасць на матэматычным, фізічным, юрыдычным, філалагічным і біялагічным факультэтах.

Паспяховасць па грамадскіх дысцыплінах склала 98,3 працэнта.

З 260 студэнтаў-камуністаў 37 атрымалі выдатныя адзнакі, 141 — выдатныя і добрыя, 57—змешаныя, 10 — толькі здавальняючыя і 15 камуністаў атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Паспяховасць камуністаў — 94,2 працэнта.

У дакладзе былі прыведзены вынікі паспяховасці студэнтаў - вячэрнікаў і завочнікаў. Добрых паказчыкаў на вячэрніх аддзяленнях дабіліся факультэты: хімічны — 91,7, геаграфічны — 90,0, біялагічны — 88,2 працэнта.

Адзначана вялікая ўвага завочнаму навучанню з боку кафедр грамадскіх навук.

Ішла размова і пра наведванне заняткаў.

Аналіз зімовай экзаменацыйнай сесіі паказаў, што ў вучэбна - выхаваўчым працэсе яшчэ шмат недахопаў і праблем, над рашэннем якіх павінен напружана працаваць увесь універсітэцкі калектыў.

Неабходна, каб супрацоўнікі, выкладчыкі, аспіранты і студэнты прадоўжылі вывучэнне матэрыялаў снежаньскага (1973) Пленума ЦК КПСС, Звароту ЦК КПСС да партыі, да савецкага народа, пастаноў ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ аб усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве работнікаў прамысловасці, будаўніцтва, транспарту, сельскай гаспадаркі за датэрміновае выкананне народнагаспадарчага плана на 1974 год. Задача заключаецца ў тым, каб не толькі вывучыць гэтыя матэрыялы, але і прыняць удзел у іх прапагандзе на прадпрыемствах і ва ўстановах Мінска, у калгасах і саўгасах падшэфнага раёна; арганізаваць чытанне лекцый, правядзенне кансультацый па праблемах сучаснай навукі і тэхнікі, аб заканамернасцях і шляхах развіцця савецкага грамадства.

Былі пастаўлены і надзённыя задачы, што датычаць паляпшэння вучэбнага працэсу, развіцця метадычнай і навуковай работы, укаранення тэхнічных сродкаў і навуковай арганізацыі працы і г. д.

На сходзе выступілі дэкан юрыдычнага факультэта В. Ф. Чыгір, старшыня мясцкома М. Я. Ляпіла, сакратар партбюро матфака І. А. Прусаў, загадчык кафедры археалогіі Э. М. Загарульскі, куратар з ФПМ В. А. Сцепановіч, прарэктар па навуковай рабоце Л. В. Валадзько, загадчык кафедры агульнай фізікі А. М. Саржэўскі, в. а. дэкана філфака У. М. Лазоўскі.

## СТАРТУЕ ТРЭЦІ СЕМЕСТР

Здаецца, зусім нядаўна здадзена зімовая сесія. На вуліцы яшчэ мароз, не растаў снег. А думкі студэнтаў ужо нястрымна ляцяць уперад, да лета. Як і дзе правесці канікулы, каб ніводны дзень не прапаў дарма? Хочацца ж і дома пабыць, бацькам дапамагчы, з сябрамі сустрэцца. Клічуць удалячынь і турысцкія сцяжынкі. А можна пабываць у доме адпачынку, з'ездзіць у цудоўны спартыўны лагер на беразе возера Нарач. Але, бадай, больш за ўсё жадаючых паехаць у будаўнічыя атрады. Таму ўжо цяпер на гістарычным факультэце поўным ходам ідзе фарміраванне СБА. Нездарма гаворыцца: «Рыхтуй сані летам, а калёсы зімой». Чым раней пачата праца, тым больш зладжана і арганізавана яна праводзіцца ў падрыхтоўчы перыяд, тым прасцей будзе канчаткова укамплектаваць атрады ў чэрвені і накіраваць іх на ўдарны працоўны фронт.

...Усхваляваныя гісторыкі, хлопцы і дзяўчаты, сабраліся ля невялікай аўдыторыі на шостым паверсе галоўнага корпуса. Тут, на сумесным пасяджэнні камітэта камсамола факультэта і штаба працоўных спраў, праходзіць зацвярджанне байцоў СБА. Начальнік штаба Анатоль Бурый выносіць на абмеркаванне кандыдатуры камандзіраў і камісараў. У 1974 годзе на гістфаку ствараюцца чатыры атрады: томскі, уральскі, малдаўскі і гарадскі. Ад правільнага падбору кіруючага саставу ў немалой ступені будзе залежаць вынік усёй іх дзейнасці. Але пакуль з гэтай прычыны хвалявацца не прыходзіцца. Усе камандзіры — А. Хамякоў, А. Бурый, У. Карагін, Т. Малажанава — людзі вопытныя, якія ўжо пабывалі ў атрадах, маюць за плячыма працоўны стаж. Рыхтуюцца да трэцяга семестра і больш паловы членаў камітэта. А камісарам гарадскога атрада будзе сакратар камітэта камсамола гістфака Генадзь Хухлындзін.

Старанны адбор байцоў у СБА прадаўжаецца. Права абараняць працоўны гонар студэнтаў БДУ прадастаўляецца самым дастойным. Пройдзе некалькі месяцаў. І час пакажа, што вялікая папярэдняя работа па фарміраванню СБА на факультэце не прапала дарэмна.

**Л. ЦІТАРЭНКА,**
**член камітэта камсамола гістфака.**

## УВАГА: КОНКУРСЫ!

Камітэт камсамола універсітэта праводзіць конкурс на лепшы фотаздымак, прысвечаны 50-годдзю з дня прысваення камсамолу імя У. І. Леніна,—«Запаветам Леніна верныя».

У фотаздымках павінна быць адлюстравана жыццё універсітэцкай камсамоліі, выкананне ёю ленінскага запавета «Вучыцца камунізму».

Праводзіцца таксама конкурс паэтаў. Лепшы верш маладзёжнай тэматыкі будзе пакладзен на музыку кампазітарам І. Лучанком.

Журы конкурсу: кампазітар І. Лучанок, паэт Н. Гілевіч, сакратар камітэта камсамола універсітэта У. Навумовіч, член камітэта камсамола Ю. Шынкар, старшыня праўлення студэнцкага клуба А. Фядотаў.

Фотаздымкі і тэксты вершаў прымаюцца ў камітэце камсамола (аўдыторыя № 207, галоўны корпус) да 15 красавіка.

Запрашаем паэтаў і фотааматараў прыняць удзел у конкурсах.

## ЯК СТАЛІ ВЫДАТНІКАМІ

АБ ГЭТЫМ і многім іншым ішла размова на сустрэчы выдатнікаў-першакурснікаў, якая адбылася на мінулым тыдні.

Адкрыў сустрэчу сакратар камітэта камсамола універсітэта У. Навумовіч. Ён павіншаваў яе удзельнікаў з поспехам, заклікаў іх і надалей быць у першых радах студэнтаў універсітэта.

Па выніках зімовай сесіі ва універсітэце 1.246 выдатнікаў, з іх 205 — студэнты першых курсаў. Найбольшая колькасць першакурснікаў-выдатнікаў на ФПМ, гістарычным і фізічным факультэтах. А вось на геафаку іх толькі чатыры.

Сярод усіх першакурснікаў многа непаспяваючых: 60 працэнтаў выключаных з універсітэта складаюць студэнты першых курсаў. Гэта вельмі хвалюе. Таму неабходна, каб кожнага ўжо з пачатку вучобы хвалявалі лёс сяброў, групы, курса, факультэта ў цэлым. Трэба, каб побач з выдатнікамі раслі і іншыя студэнты. Аб гэтым гаварылі ў сваіх выступленнях загадчык кафедры палітычнай эканоміі прыродазнаўчых факультэтаў І. Д. Прахарэнка, начальнік вучэбнага аддзела В. С. Далгарукаў, старшыня СНТ універсітэта Я. Ціткоў. Выступілі таксама дэлегат XXV з'езда камсамола Беларусі, студэнтка IV курса філфака Л. Тарасюк, загадчык інтэрсектара камітэта камсамола Т. Краўцова і намеснік сакратара камітэта камсамола гістфака Г. Ільяшчук.

Удзельнікі сустрэчы прынялі зварот да ўсіх студэнтаў - першакурснікаў універсітэта.





## ПАДЗЯКА ЗА ГАСЦІННАСЦЬ

У адрас рэктара БДУ прафесара У. М. Сікорскага і старшыні прафкома А. М. Жылінскага прыйшло пісьмо за подпісам старшыні ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў Т. Янушкоўскай, у якім гаворыцца: «Цэнтральны камітэт прафсаюза дзякуе вам асабіста і ўсім супрацоўнікам універсітэта за сардэчны прыём, аказаны ўдзельнікам Усесаюзнага семінара-нарады старшынь студэнцкіх прафкомаў універсітэтаў і гуманітарных вну, змястоўную і рознабаковую праграму канцэрта мастацкай самадзейнасці, за прадастаўленую магчымасць пазнаёміцца з умовамі працы, быту і адпачынку студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта».

# ПАВАГА І ЛЮБОЎ

## ТОЛЬКІ АДЗІН ДЗЕНЬ



Гарэць, каб было светла.

(Р. Гамзатаў, з кнігі «Мой Дагестан»)

**— Іраіда Осіпаўна, калі ў Вас пачынаецца працоўны дзень?**
**— А палове дзевятай.**

(Размова па тэлефоне).

ЯШЧЭ аўдыторыі не запоўніліся паўсоннымі студэнтамі. Яшчэ не празвінеў званок, які абвяшчае пачатак заняткаў першай змены, а Іраіда Осіпаўна ўжо гартае свой дзённік. «Што гэта ў мяне на сёння? Ага, прыйдуць студэнты на кансультацыю па курсавой рабоце, потым—размеркаванне дадатковых стыпендый, затым...». Стук у дзверы: першы наведвальнік. Пакуль Іраіда Осіпаўна цярпліва растлумачвае нешта высокаму хлопцу, у кабінет заходзяць яшчэ некалькі чалавек. Яна адказвае на прывітанні і ківае на крэслы: сядайце, маўляў, зараз вызвалюся.

Дзверы расчыняюцца. На парозе выкладчык:

— Іраіда Осіпаўна, ніякіх даручэнняў няма? Іду на заняткі.

— Не, Фёдар Макаравіч, пакуль што нічога. Потым зойдзеце па пытанню алімпіяды.

Так пачынаецца самы звычайны працоўны дзень у дэкана гістарычнага факультэта І. О. Царук. І, трэба дадаць адразу, адзінага дэкана-жанчыны ва універсітэце.

Яшчэ некалькі наведвальнікаў. Студэнта-дыпломніка хвалюе лёс сваёй работы. Хлапцу-спартсмену патрэбна грашовая дапамога, і дэкан абяцае зрабіць усё магчымае. А вось член студсавета інтэрната, дзе жывуць гісторыкі, Віталій Сілін затрымліваецца крыху больш. Размова сур'ёзная: нядаўна адбылося чарговае пасяджэнне студсавета. Абмеркавалі планы работы. Іраіда Осіпаўна заўважае:

— Не забывайце аб тым, што наш інтэрнат трымае першае месца.

Рабяты памятаюць. І робяць усё, каб яго ўтрымаць: і за чысцінёй сочаць, і розныя сустрэчы і вечары наладжваюць.

—Ну, а ў самога як справы, на курсе?

Хлопец бянтэжыцца:

— Дзякуй, усё добра.

На гістарычным факультэце вядзецца вялікая навуковая работа. Акрамя ўдзелу ў агульнауніверсітэцкіх студэнцкіх навуковых канферэнцыях, гісторыкі праводзяць свае. Адна з іх запланавана на красавік і прысвечана Дню адраджэння Польшчы. Дарэчы, аб гэтым свяце. Вырашаецца правесці тыдзень ПНР. І ўжо сёння гэта — адзін з клопатаў дэкана. Трэба афарміць выстаўку, абмеркаваць тэмы гутарак і дакладаў, запрасіць у госці консула ПНР і многае іншае. А там — балгарскі тыдзень, дні ГДР. Ужо ў сакавіку пройдзе канферэнцыя «XXIV з'езд і Праграма міру».

Чалавеку, які мала знаём з пастаноўкай работы СНТ на гістфаку, можа здацца нерэальным такое мноства канферэнцый. Аказваецца — рэальна. Калі занята многа людзей. І калі выкладчыкі, і ў першую чаргу І. О. Царук, умеюць перадаць студэнтам сваю зацікаўленасць.

Заходзяць усё новыя і новыя людзі, і ў невялікім кабінеце адразу становіцца цесна. Аляксандр Пятровіч Ігнаценка і Андрэй Герасімавіч Кляцкоў — лепшыя памочнікі дэкана—раскладваюць свае паперы. Другі дзень ідзе размеркаванне дадатковых стыпендый. Справа нялёгкая і не зусім прыемная. У адной дзяўчыны бацькі інваліды, у другой маці памерла, і на руках засталіся маленькія браты і сёстры, таму без стыпендыі будзе цяжка. Ну, а гэты — добры хлопец. А вось дысцыпліна кульгае...

Іраіда Осіпаўна зноў і зноў праглядае спісы.

Загадчык музея С. К. Камінскі заходзіць некалькі разоў. Размова ўсё пра 605-ю аўдыторыю. Шторы там ужо вешаюць, з электрыкам дамовіліся...

Пра таямнічую 605-ю Іраіда Осіпаўна абяцае расказаць потым і нават паказаць, а зараз спяшаецца—праз пяць хвілін пасяджэнне ў рэктараце.

* * *

У другой палове дня да запланаваных спраў (прагляд работ для ўдзелу ў алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», гутарка з начальнікам штаба працоўных спраў факультэта, абмеркаванне з памочнікам, Міхаілам Кузьмічом Мазурэнкам, графіка патыднёвага праходжання дысцыплін і інш.) прыбавіліся і незапланаваныя. Адна з іх — прыход Галі Ільяшчук. Дзяўчына ў гэтым годзе адказная за СНТ у камітэце камсамола. Пытанняў і цяжкасцей шмат, а да каго ісці за дапамогай, як не да Іраіды Осіпаўны Тут і пра зборнік СНТ можна пагаварыць, і, як гавораць студэнты, «за жыццё». Дарэчы, пра зборнік. Ідэю яго стварэння падала дэкан. Рабяты спачатку сумняваліся: ці атрымаецца? Іраіда Осіпаўна пераконвала, і зараз савет СНТ паверыў у свае сілы, і ўжо вядзецца абмеркаванне навуковых работ, якія ўвойдуць у зборнік.

Іраіда Осіпаўна гутарыла з Галяй доўга. Збоку гэта нагадвала размову двух сяброў, адзін з якіх больш сталы і мудры, а можа, гэта — маці і дачка, у якіх агульны сямейны клопат...

Потым былі нейкія справы ў факультэцкім музеі, які вырашана расшырыць і папоўніць. Іраіда Осіпаўна ўжо марыць, як гэта будзе. І іншых заклікае:

— Давайце разам памарым!

Нарэшце мы трапілі ў 605-ю —гонар факультэта, — аснашчаную тэхнічнымі сродкамі навучання аўдыторыю. Сёння тут яшчэ ідуць апошнія работы, а ўжо заўтра ў час лекцый будуць дэманстраваць кінафільмы.

Шэраг указанняў лабарантам, і зноў тэлефонныя званкі, гутаркі. Дзень жа яшчэ не скончан. Самы звычайны дзень, які далёка не поўнасцю раскрывае характар Іраіды Осіпаўны, яе чалавечыя якасці, здольнасці кіраўніка. Але, няма сумнення, што да дзесяткаў віншаванняў дэкана з днём 8 Сакавіка прыбавяцца добрыя пажаданні і тысяч нашых чытачоў.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**



Мал. **Т. Засім.**



Выдатніца, актывістка і ўвогуле добрая дзяўчына Іра Калеснікава, студэнтка II курса аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта.

Фота **П. Грабенчука.**

## СЯБРОЎКІ

— Многа добрых дзяўчат жыве ў нашым інтэрнаце. Вось хоць бы завітайце у пакой № 601. Там жывуць балгаркі Стаянка Жэлева і Мая Антава і беларускі Валя Рашэнкіна і Тамара Панамарцава. Дружныя дзяўчаты, таму ў іх ідэальны парадак, з густам абстаўлен пакой, — сказалі мне члены студсавета інтэрната № 7 Таня Патупчык і Мар'ян Місюк.

Прыемна зайсці ў пакой. Прыгожа засланыя ложкі, на вокнах гардзіны, ад парога да стала вядзе дарожка. Калі мы завіталі ў гэты пакой, дома была адна Стаянка. Яна з задавальненнем расказвае пра сваіх сябровак.

— Жывём, як сёстры. Калі ў кагосьці радасць, дзелім разам, непаладкі — зноў разам.

Пасябравалі дзяўчаты адразу. Перавезлі свае няхітрыя студэнцкія пажыткі, навялі ў пакоі парадак, разгаварыліся, пазнаёміліся. Доўга ў той вераснёўскі вечар не маглі заснуць. Стаянка і Мая расказвалі пра Балгарыю, а Валя і Тамара слухалі, час ад часу задавалі пытанні. А потым гаварылі Валя з Тамарай пра родную Беларусь, пра Мінск, пра сваіх сяброў.

Дні беглі адзін за другім, разам дзяўчаты спяшаліся на заняткі, разам беглі ў кіно, тэатр ці на студэнцкі вечар. А затым дома дзяліліся ўражаннямі. Калі патрэбна было каму-небудзь дапамагчы ў вучобе, садзіліся ўсе разам і высвятлялі незразумелае.

Вучацца дзяўчаты на IV курсе факультэта прыкладной матэматыкі. У кожнай з іх свая спецыялізацыя. Але гэта не толькі не разлучае іх, а, наадварот, зблікае. Стаянка расказвае, што новае на кафедры вылічальнай матэматыкі, а Мая з Валяй дзеляцца справамі сваіх калектываў.

Балгарскія дзяўчаты пазнаёміліся з нашай рэспублікай. Мая Антава пабывала дома ў Валі Рашэнкінай.

— Мы так прывыклі адна да адной, як сапраўдныя сёстры. Мне і Маі падабаецца Беларусь, Мінск. У хуткім часе мы развітаемся з Мінскам і павязём з сабой у Балгарыю добрую памяць аб універсітэце, — працягвае Стаянка.

...За святочным сталом Стаянка, Мая, Валя і Тамара збяруцца разам. І будуць звінець беларускія, рускія, балгарскія песні, славячы дружбу.

**І. ЯНКОЎ.**

## КРЫНІЦА ДОБРАГА НАСТРОЮ

Па характару сваёй работы мне часта даводзіцца бываць у розных аддзелах універсітэта, але ў адзін — па разліку заработнай платы бухгалтэрыі, які ўзначальвае Алімпіяда Іванаўна Казакова, я заходжу з асаблівым задавальненнем. Спакойная, дзелавая, скажу нават, якаясьці вельмі ветлівая атмасфера тут пануе. Ніколі не чула, каб у гэтым калектыве вяліся пабочныя размовы, каб адказалі камусьці нетактоўна або адмахнуліся ад наведвальніка. Не было і выпадку за восем год, як я ведаю гэты калектыў, каб згубілася патрэбная папера ці дакумент. Напэўна, не толькі загружанасць работай вызначае такі стыль. Галоўнае, на маю думку, — адказнасць за сваю справу, высокая агульная культура. Адсюль і культура працы, дзелавітасць, уважлівасць.

З вялікім задавальненнем віншую супрацоўніц гэтага аддзела — Алімпіяду Іванаўну, Ірыну Сяргееўну Бурдзейка, Зою Пракоф'еўну Цімчанка, Ганну Максімаўну Каспяровіч з Міжнародным святам жанчын і жадаю ім заўсёды быць такімі ж уважлівымі, шчырымі, ветлівымі.

**А. КАВАЛЁВА,**
**экспедытар канцылярыі.**

# ТАБЕ, ЖАНЧЫНА!

## РАДАСНАГА ВАМ СВЯТА!

Ронка Велева, Марыяна Іванава, Снежа Манолава і Анюта Энчава вучацца на факультэце прыкладной матэматыкі. Трэці год яны сустракаюць 8 Сакавіка ў Савецкім Саюзе. Як гэта водзіцца, юнакі рыхтуюць для дзяўчат падарункі, урачыста віншуюць. Па-студэнцку весела праходзіць свята. А як святкуюць Міжнародны жаночы дзень у Балгарыі?

— Розніца, бадай, толькі ў адным, — гавораць дзяўчаты. — У нас на радзіме гэта працоўны дзень. Усё астатняе, як і ў вас: віншуюць жанчын — працаўніц, маці, падносяць ім кветкі.

— Напэўна, будзе дарэчы, калі вы напярэдадні 8 Сакавіка раскажаце пра сваё веснавое свята. Мне здаецца, у Балгарыі такое ёсць?..

— Так, ёсць. 1 сакавіка лічыцца ў нас днём наступлення вясны. Існуе балгарскі звычай віншаваць у гэты дзень адзін аднаго і з пажаданнем шчасця дарыць своеасаблівыя чырвона-белыя маленькія сувеніры — «марцініцы». «Марцініцы»— знак дружбы, кахання, спагады—прышпільваюць і носяць на вопратцы. Быццам нічога асаблівага, а ў людзей паяўляецца добры настрой...

Сустрэча з сімпатычнымі, жыццярадаснымі балгарскімі дзяўчатамі была прыемнай, хаця і кароткай. На развітанне Марыяна падарыла мне «марцініцы» — чырвона-белых ніцявых чалавечкаў, сімвал вясны і дружбы.

А мне хочацца пажадаць нашым балгарскім сяброўкам напярэдадні 8 Сакавіка поспехаў у вучобе, добрага настрою, радаснага свята.

**С. БЕРАСЦЕНЬ.**



**На здымку:** (злева направа) Ронка **Велева**, Анюта **Энчава**, Марыяна **Іванава** і Снежа **Манолава** са сваёй беларускай сяброўкай Валяй **Лагун**.

Фота аўтара.



Многія ведаюць ст. бухгалтара матэрыяльнага аддзела бухгалтэрыі Т. П. Баёк і бухгалтара гэтага ж аддзела Е. В. Малалеткіну як добрасумленных працаўніц і добразычлівых людзей. Іх праца неаднойчы адзначана падзякамі, граматамі, прэміямі.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

## НАШ СЯБРА КУРАТАР

Здаецца, гэта было зусім нядаўна. Можа ўчора, а можа месяц, тыдзень прайшоў? Не, прайшло ўжо чатыры гады, але я помню той верасньўскі дзень. Нас, першакурснікаў, віншавалі з пачаткам студэнцкага жыцця, жадалі чацвёрак, пяцёрак. Затым мы разбегліся па аўдыторыях. І калі пранізлівая і крыху непрывычная трэль званка змоўкла, у аўдыторыю ўвайшла сярэдняга росту, далікатная, ветлівая жанчына.

— Добры дзень, рабяты. Я Ангеліна Аляксандраўна Рудэнка, ваш куратар, — прадставілася яна, углядаючыся ў нашы твары.

Пачаліся студэнцкія будні. Кожны дзень Ангеліна Аляксандраўна прыходзіла да нас у групу, па-сяброўску цікавілася справамі і прапаноўвала правесці экскурсію ў музей, на ВДНГ, сабрацца пасля заняткаў, каб абмеркаваць тое ці іншае хвалюючае пытанне.

Сучасная руская мова — прадмет не з лёгкіх. І Ангеліна Аляксандраўна старалася, каб кожны студэнт добра засвоіў вывучаемы матэрыял. Некаторыя, бывала, нават плакалі, атрымаўшы па кантрольнаму дыктанту нездавальняюча. Ангеліна Аляксандраўна бачыла ўсё: шчаслівыя ўсмешкі і слёзы на вачах. Незадоўга да званка яна звычайна гаварыла: «Пытанні? Калі ласка».

І цярпліва тлумачыла.

А як праходзілі ў нас камсамольскія сходы! Уважліва аналізавалі прычыны няўдач, разам знаходзілі цікавыя рашэнні.

...Бягуць гады. Мы ўжо — чацвёртакурснікі. Але і цяпер мы звяртаемся да Ангеліны Аляксандраўны за парадай, дзелімся радасцю, давяраем ёй свае думкі...

Напярэдадні свята мне хочацца ад імя нашай групы павіншаваць Ангеліну Аляксандраўну Рудэнка са святам.

**І. СЦЯПУРА.**



Пятнаццаць год нясе вахцёрскую службу ў БДУ Фаіна Іванаўна **Хадзькова.**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

## ГІСТОРЫЯ...

У гэтым годзе ў шэсцьдзесят чацвёрты раз мы адзначаем Міжнародны жаночы дзень 8 Сакавіка. Рашэнне аб штогадовым правядзенні гэтага дня было прынята ў 1910 годзе ў Капенгагене на Міжнароднай канферэнцыі жанчын-сацыялістак па прапанове выдатнай дзяячкі пралетарскага руху, нямецкай камуністкі Клары Цэткін. Гэта пастанова была вынесена, як пісала яна, пад уплывам рускай рэвалюцыі 1905 года, пад уплывам забастовак і рэвалюцыйных баёў у Маскве, у якіх побач з мужчынамі змагаліся жанчыны. Клара Цэткін гаварыла, што, прапануючы адзначаць Міжнародны жаночы дзень, яна імкнулася стварыць дзень рэвалюцыйнай мабілізацыі шырокіх жаночых мас супраць буржуазнага панавання.

З той пары 8 Сакавіка прызнан днём салідарнасці усіх працоўных жанчын зямлі ў барацьбе за свае правы ў грамадстве і ў сям'і.



**Заняткі са студэнтамі падрыхтоўчага факультэта вядзе выкладчыца матэматыкі Г. С. Літвіненка.**

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

## АД ШЧЫРАГА СЭРЦА

Заўтра свята вясны і ўсмешак — Міжнародны жаночы дзень. І ў такі дзень кожнай дзяўчыне цікава ведаць, чым яна можа спадабацца рабятам. Дык вось, увага, дзяўчаты! Адказваюць студэнты і супрацоўнікі фізфака — сур'ёзныя людзі, але з пачуццём гумару...

Першыя восем чалавек, пачуўшы запытанне «Што вам падабаецца ў дзяўчатах?», — шырока раскрывалі поўныя жаху вочы і спяшаліся хутчэй пайсці. Але крыху цярпення і настойлівасці — і вось ужо адзін згадзіўся даць адказ. Але, удакладніўшы сутнасць пытання, знік і з сумам у голасе адказаў:

— Вы ж у жанатага чалавека пытаецеся! На дзяўчат я і не гляджу!..

І як мы ні стараліся, ён больш нічога так і не сказаў. Даведаліся толькі, што наш субяседнік з IV курса.

«Такога больш не будзе», — падумалі мы... і памыліліся. Таму што яшчэ адзін невядомы (таксама з чацвёртага курса) адказаў нам (агледзеўшыся) хутка:

— Я ў дзяўчатах цаню сціпласць і жаноцкасць. А больш нічога не скажу — яшчэ жонка даведаецца!— і ўцёк.

А затым усё пайшло лепш. Сяргей Церахаў, II курс, адказаў:

— Мяне ў дзяўчатах прыцягвае жаноцкасць і розум, а што не падабаецца — цяжка сказаць!

Тэхнік кафедры РТ і ФЭ Уладзімір Каспяровіч адказаў коратка і рашуча:

— Прыцягвае шчырасць, самаадданасць, чысціня душы.

А Юрыю Сідаровічу і Уладзіміру Курачыцкаму (II курс) падабаюцца Сапраўдныя Дзяўчаты.

Невядомы першакурснік:

— Празмерная какетлівасць (альбо поўная яе адсутнасць) мне не падабаюцца зусім (!?).

— А што ў іх добрага! — заявіў пяцікурснік. Хутчэй за усё ён проста не падумаў, таму і не назваў сваё імя.

В'етнамскі студэнт Лыу Лан з пятага курса старанна ўзважыў усе «за» і «супраць» і адказаў:

— Дзяўчына павінна весці сябе строга, прытрымлівацца акуратнасці ў адзенні. Падабаецца мне ў дзяўчатах пяшчотнасць. Зусім не падабаюцца ультрамодныя дзяўчаты.

— Сціпласць, унутраная інтэлігентнасць, розум, спагадлівасць вельмі ўпрыгожваюць дзяўчыну. — Гэта меркаванне Міхаіла Волкава.

Уладзімір Новыш (III курс) думаў вельмі доўга. І вось што заявіў:

— Мне падабаецца арыгінальнасць (сапраўдная, шчырая, калі чалавек ад сябе ідзе, а не імкнецца быць падобным на іншых), развітасць інтарэсаў. Вельмі цаню самую звычайную чалавечнасць.

— Знешняя і ўнутраная прыгажосць, розум,— гэтыя якасці дзяўчат паставіў на першае месца Віктар Урбановіч (III курс).

Можна было б паставіць кропку, але ўсё ж цікава даведацца пра погляды саміх дзяўчат.

Надзя Амярканава, Ніна Мялешка, Вольга Алдохіна, Таня Шмурадка і тры дзяўчыны з VI групы першага курса лічаць, што рабятам павінны падабацца: жыццярадаснасць, абаяльнасць, сціпласць, прынцыповасць, дабрата, жаноцкасць і чыста жаночая непасрэднасць.

Што ж, будзьце такімі! І пастарайцеся, каб аб кожнай з вас можна было сказаць словамі Івана Сташулёнка, пяцікурсніка фізфака:

— Якія яны ёсць, такімі няхай і будуць!

Са святам вас, дзяўчаты!

**В. ЛЯЛЕКА,**
**А. ПАТАПЕНКА.**

## І СУЧАСНАСЦЬ

Ёсць статыстычныя паказчыкі, якія даюць ёмкі малюнак нашых сацыяльных зрухаў: 59 працэнтаў усіх спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, занятых у народнай гаспадарцы нашай краіны, — жанчыны. 31 працэнт жанчын — сярод інжынераў, 40 працэнтаў — сярод спецыялістаў сельскай гаспадаркі, 71 — сярод настаўнікаў, 72 працэнты — сярод урачоў. Гэта сённяшні дзень. Зазірнуўшы ў навучальныя ўстановы краіны, можна ўбачыць, якое месца зоймуць жанчыны ў народнай гаспадарцы і культуры заўтра: больш паловы студэнтаў у вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах — дзяўчаты.

Звыш 350 тысяч жанчын заняты навуковай работай: 60700 — кандыдаты навук, 3100 — доктары навук, 1800 — акадэмікі, члены-карэспандэнты акадэмій навук, прафесары.

Звыш паўмільёна жанчын — дырэктары прамысловых прадпрыемстваў, саўгасаў, адміністрацыйных устаноў, кіраўнікі будоўляў, старшыні калгасаў. Жанчыны займаюць кіруючыя пасады ў самых розных галінах народнай гаспадаркі.

# КАЛЯНДАР

## САКАВІКА



**2 сакавіка** — 150 год з дня нараджэння К. Д. Ушынскага (нар. у 1824, па стар. крыніцах—у 1823, памёр у 1871), рускага педагога.

**5 сакавіка** — 45 год назад (1929) у «Правде» быў апублікаван зварот калектыву ленінградскага завода «Чырвоны выбаржац» да ўсіх прадпрыемстваў СССР з заклікам арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва.

**7 сакавіка** — 80 год з дня нараджэння С. Г. Лазо (1894—1920), героя грамадзянскай вайны.

**8 сакавіка — МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ.**

**9 сакавіка** — 160 год з дня нараджэння Т. Р. Шаўчэнкі (1814—1861), украінскага паэта, мастака, рэвалюцыянера-дэмакрата.

**11 сакавіка**—80 год з дня нараджэння Ота Гротэволя (1894—1964), дзеяча германскага рабочага руху, дзяржаўнага дзеяча ГДР.

**12 сакавіка 1917 г.** — Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Расіі. Звяржэнне царскага самаўладдзя. Утварэнне Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

**14 сакавіка 1883 г.** — памёр Карл Маркс.

**15 сакавіка** — 80 год з дня нараджэння (1894) Б. М. Кербабаева, туркменскага савецкага пісьменніка.

**18 сакавіка 1965 г.** — касманаўт А. А. Ляонаў здзейсніў першы ў свеце выхад у адкрыты космас з борта карабля «Усход-2», пілатуемага касманаўтам П. І. Бяляевым.

**18 сакавіка** — Дзень Парыжскай камуны.

**23 сакавіка** — 55 год з дня ўтварэння (1919) Башкірскай АССР.

**27 сакавіка** — Міжнародны дзень тэатра.

**30 сакавіка 1971 г.** — адкрыццё XXIV з'езда КПСС.

**31 сакавіка** — 80 год з дня нараджэння (1894) С. В. Ільюшына, савецкага авіяканструктара.

# АПОШНЯЕ «НІ ПУХУ»...

Дзень сёння — асаблівы. Радасны і крышачку сумны. Сёння для 132 жыхароў краіны Геафакіі прагучыць апошні званок у сценах універсітэта...

Як вялікі букет кветак, стракацяць сукенкі дзяўчат. Хлопцы адразу пасталелі: як-ніяк «без пяці мінут» маладыя спецыялісты.

...Цёплыя віншаванні, словы на дарогу ад выкладчыкаў: намесніка дэкана Р. А. Жмойдзяка, В. Р. Заўрыева, Р. У. Гілевіч, В. А. Навіцкага, куратара В. С. Аношкі.

На сцэну выходзяць пяцікурсніцы Эма Холад і Валя Антановіч. У знак павагі і ўдзячнасці дзяўчаты doраць выкладчыкам букеты пахучых руж.

І раптам... «Увага! Увага! Вас вітаюць каралева Заліковая Кніжка і Вярхоўны Жрэц краіны Геафакіі»! Гэта яны пасвячалі іх у студэнты пяць год назад, яны ж праводзяць сёння сваіх «падданых» у вялікую дарогу.

Вярхоўны Жрэц паведамляе сабраўшымся, колькі двоек і пяцёрак атрымалі выпускнікі за гады вучобы, колькі імі было з'едзена «студэнцкіх піражкоў»... Правіцелі Геафакіі ўзнагароджваюць «лаўровымі» вянкамі пяцікурснікаў — ленінскага стыпендыята Н. Рубісава і выдатніка А. Карабанава, шакаладнымі медалямі— стараст і тых, хто быў прыкладам у вучобе, грамадскім жыцці, «нестандартнымі» сушкамі — спартсменаў V курса.

Гучаць жарты, смех. Пажадаўшы выпускнікам студэнцкага «ні пуху, ні пер'я», правіцелі краіны велічна пакідаюць залу.

Гучаць словы гімна геаграфаў. Яго спявае ўся зала.

Свята працягваецца. Як звычайна, танцавальная частка праграмы праходзіць у суправаджэнні вакальна-інструментальнага ансамбля географаў «Пілігрымы».

**Н. НОВІКАВА.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**



**Гэты дзень застанецца ў памяці на ўсё жыццё: хвалюючы, радасны і адначасова крыху сумны. Хутка выпускнікі скажуць: «Да пабачэння, БДУ!».**

**Фота Н. Шчынскай.**

# ДЗЁННІКІ ЗОРНЫХ ПАХОДАЎ

**У час зімовых канікул студэнты розных факультэтаў былі ўдзельнікамі зорных паходаў. Сёння мы даём слова прадстаўнікам біяфака.**

# НЕЗВЫЧАЙНЫ ТЫДЗЕНЬ

**ДЗЕНЬ ПЕРШЫ.** Як заўсёды, гэта дзень бегатні. Купілі білеты, але гэта яшчэ нічога не азначае. У 14-00 трэба афарміць камандзіроўкі. А лыжаў няма. Як на ліха, захварэў кладаўшчык. Пакуль Эдзік Вальчэўскі бегае па інстанцыях і дабіваецца іх выдачы, мы з А. Т. Федаруком носімся па паверхах галоўнага корпуса і афармляем маршрут. Тэрмінова закупляюцца прадукты. Марудзіць нельга. І вось нарэшце ўсё зроблена. Праз пяць гадзін язды аўтобусам прыбылі ў Бягомль. Далей—сваім ходам.

**ДЗЕНЬ ДРУГІ.** Камандзір лектарскай групы А. Т. Федарук сказаў: «Замест снедання будуць лекцыі». І нашы рабяты ланцужком рушылі к мясцовай сярэдняй школе. Праз паўтары гадзіны ўжо было прачытана 6 лекцый аб творчасці Прышвіна, аб біясферы, аб БДУ. Толькі галодныя лектары ўзяліся за смачную тушонку, як прыйшла настаўніца і папрасіла прачытаць яшчэ адну лекцыю для яе класа. І зноў два байцы «культурнага фронту» накіраваліся ў школу. Выбраліся з Бягомля толькі ў 11 гадзін. А шлях нам прадстаяў доўгі, праз лясы Бярэзінскага запаведніка да навуковага цэнтра Крайцы.

Лыжы беглі самі. Навокал цудоўны хвойны лес. Цёпла. Снег асеў, і мы ішлі па насту. Вечарам былі ў Крайцах.

**ДЗЕНЬ ТРЭЦІ.** Ранкам наведалі музей запаведніка. Сталі на лыжы і пайшлі к вальерам з дзікімі жывёламі. Скармілі ўвесь хлеб зубрам і толькі тады падышлі да клеткі з мядзведзямі. Мішкі абрадаваліся гасцям і наладзілі цудоўны канцэрт для нас. Зашчоўкалі фотаапараты, загула кінакамера. А таптыжкі зусім не сароменліся і прадаўжалі сваё выступленне. На развітанне самы малодшы з іх нават дазволіў паказытаць сябе за вухам. А другі намагаўся ўхапіць нашых дзяўчат за кішэні штармовак, так яму не хацелася, каб яны адыходзілі.

К абеду мы прыбылі ў Домжарыцы. Пакуль адны чыталі ў школе лекцыі, іншыя рамантавалі лыжы. Надвячоркам былі ў Лепелі.

**ДЗЕНЬ ЧАЦВЁРТЫ.** Лепель усім вельмі спадабаўся. Гарадок чысты, акуратны. Тут з нашымі лектарамі адбыліся чарговыя прыгоды. Не глянулі на нумар школы, а прыйшлі як чаканыя госці. І пакуль А. Т. Федарук расказваў аўдыторыі аб Прышвіне, выкладчыцкі састаў школы, з якой мы дамовіліся загадзя, разаслаў па гораду аператыўныя групы шукаць прапаўшых мінскіх лектараў. Нарэшце яны былі знойдзены і ім прыйшлося паўтарыць сваё выступленне. Час прайшоў непрыкметна. А ў 14 гадзін нас чакалі школьнікі вёскі Камень. Трэба было штосьці тэрмінова рабіць. І мы вырашылі: у 13-30 лектарская група на аўтобусе накіравалася ў Камень. Лектары паспелі ў час. Усе засталіся задаволенымі, але нам трэба было рухацца далей. Змяркалася, аднак сталі на лыжы.

У поўнай цемры, нарэшце, закончылі 15-кіламетровы кідок і падышлі к доўгачаканаму інтэрнату.

**ДЗЕНЬ ПЯТЫ.** Увесь дзень ідзём па азёрах, а ім няма ні канца, ні краю. Па зямлі сцелецца туман. Лыжы дрэнна слізгаюць. Кожнаму прыходзіцца пракладваць сваю лыжню, таму што пад тонкай ледзяной коркай — рыхлы, мокры снег. Павінны начаваць у вёсцы Паульe. Прыходзім туды каля шасці вечара. Але пачатковая школа, у якой мы разлічвалі заначаваць, закрыта. Пачынае імжаць дождж, а нам прыходзіцца ісці яшчэ каля 10 кіламетраў. Згодна з картай, у гэты дзень прайшлі каля 40 кіламетраў.

**ДЗЕНЬ ШОСТЫ.** Блізкі канечны пункт нашага маршруту — Полацк. Прыкметна падымаецца настрой. Праходзім шэраг буйных азёр, Паульe, Яноўскае, Гомельскае. На лёдзе размясціліся полацкія рыбакі.

На аўтобусе да Полацка ўсяго 50 мінут язды. Нарэшце, падыходзім да гомельскай сярэдняй школы. Тут таксама прачыталі лекцыі.

**ДЗЕНЬ СЁМЫ.** Полацк. Поезд на Мінск адыходзіць позна вечарам. Таму мы паспелі пабываць у полацкім педвучылішчы імя Ф. Скарыны. Прачыталі там лекцыю. Прынялі нас вельмі цёпла. Дзяўчаты паказалі ўсе гістарычныя месцы гэтага старажытнага горада, якому споўнілася 1112 год. Разгаварыліся, пазнаёміліся. На памяць аб наведанні Полацка ў нас застануцца фотаздымкі і альбом, які падарылі нам студэнты вучылішча.

Маршрут закончан. І я ўпэўнен, што рабяты, якія ўдзельнічалі ў ім, яшчэ не адзін раз адправяцца ў падарожжа.

**А. ВАДЭЙКА,**
**студэнт III курса біяфака.**

# ЭХ, ДАРОГІ...

### *ЗАМЕСТ УСТУПА*

Калі вы раптам пачынаеце заўважаць, што неба пахмурнае, дамы шэрыя, прахожыя панурыя, а сябры няўважлівыя і ў дадатак да ўсяго з чарговым візгам прытармазіўшага аўтамабіля вы адчуваеце незваротную ўтрату каштоўных нервовых клетак, — дыягназ вядомы: вам патрэбна неадкладна змяніць абстаноўку.

Карацей — у паход!

### *ЯК ГЭТА ПАЧЫНАЛАСЯ*

Цёплае развітанне са сваімі сабратамі—групай А. Т. Федарука ля дзвярэй ЦК камсамола, дзе мы атрымалі благаславенне (фінансавае таксама).

— Анатоль Тарасавіч! Вы удакладнілі маршруты мясцовага транспарту?

— На спадарожныя не спадзявайцеся.

— А вы не забылі мазуту для лыж, якая патрэбна пры тэмпературы +10 градусаў?

— Але, да сустрэчы ў Мінску!

### *ЛІРЫЧНАЕ АДСТУПЛЕННЕ*

Турысцкі паход... Гэта не толькі пройдзеныя кіламетры, не толькі рукзакігарбы, не толькі стомленасць і адлучанасць ад благ цывілізацыі...

Кожны паход—гэта мноства ўражанняў, роздумаў, вывадаў, адкрыццяў, гэта своеасаблівая крыніца вашага пазнання свету. Тут вы правяраеце і перагледжваеце свае ўяўленні аб сабе, аб людзях, аб прыродзе.

### *АДКРЫЦЦЁ, АБО ПАЦВЯРДЖЭННЕ НЕКАТОРЫХ ІСЦІН*

1. (Пацвярджэнне таго, што мы ішлі на лыжах). Не засмучайцеся, снег у Беларусі пакуль што не перавёўся. У Бярэзінскім запаведніку мы мелі задавальненне праваліцца па паясніцу.

2. (Пацвярджэнне старой ісціны). Паветра ў лесе значна адрозніваецца ад мінскага па сваім якасным саставу. У ім няма выхлапных газаў, каварнага CO, копаці і гары — усіх гэтых неад'емных прыправаў сталічнага паветра. Аднак праз дзень-другі мы прывыклі да новай дыхальнай сумесі, і галава ўжо не ішла кругам ад недахопу вуглекіслаты і сажы. (Вялікая справа — адаптацыя).

3. (Пацвярджэнне таго, што можна ні аб чым не думаць). Для гэтага трэба: надзець цяжкі руказак, забыць пра нацёртыя ногі, пра будучую вячэру і, не адрываючыся, глядзець на кончыкі лыж таварыша, што ідзе наперадзе. Эфект надзвычайны: за дзень пераходу вы не ўтрымаеце ў галаве ніводнай думкі. Поўны адпачынак вашаму мозгу, які вытрымаў столькі сесій!

4. (Пацвярджэнне фізіялагічнай ісціны). Спаць можна, дзе толькі ёсць магчымасць: на купіне раскісшых лыжных чаравікаў, на сухіх хваёвых дровах, на банках з тушонкай, пад засенню школьнай парты. Не хвалюйцеся, вашы распешчаныя целы будуць гэтак ныць, што невялікія нязручнасці застануцца незаўважанымі. Тэматыка сноў—непаўторная па сваёй арыгінальнасці.

### *РАСКАЗ АДНОЙ ЖАНЧЫНЫ*

— Як іду гэтай дарогай —абавязкова ўбок звярну, крук зраблю—у шпіталь партызанскі. Пахаджу сярод зямлянак, пасяджу...

Камок да горла падкочваецца. Якія людзі тут былі!

А нядаўна да нас у вёску герой-партызан прыязджаў: тут ваяваў. Мой сын звадзіў яго ў лагер. Увесь дзень партызан там прабыў. Задумлівы вярнуўся...

У кожнай вёсачцы помнік з пяціканцовай зорачкай і суровы пералік загінуўшых... У памяці ўсплываюць словы песні:

Беларусь поросла обелисками,

Оттого звезды стали нам близкими.

Выносіш з усяго ўбачанага самае галоўнае і каштоўнае — схіленне з глыбокай пашанай перад простымі людзьмі. Пакораны іх добрасардэчнасцю, захапляешся іх аптымізмам, удзячны за прыклад сапраўднай чалавечай годнасці.

### *ПАСЛЯСЛОЎЕ*

Вось ужо другі год на нашым факультэце ў час зімовых канікул арганізуюцца турысцкія зорныя паходы. Мэта іх— не толькі спартыўная, але і пазнавальная. У час паходу студэнты чытаюць лекцыі ў сярэдніх школах сёл і вёсак. Тэматыка іх рознабаковая: аб праблеме аховы дзікіх жывёл, водных рэсурсаў, аб біясферы і аб БДУ, а таксама лекцыі на ідэалагічныя тэмы. Патрэбна адзначыць, што гэтыя выступленні, як правіла, карыстаюцца поспехам і з цікавасцю прымаюцца вучнямі старэйшых класаў.

У гэтым годзе на біяфаку сфарміраваліся дзве турысцкія групы.

За час паходу студэнты прачыталі 50 лекцый. Асаблівая заслуга ў гэтым належыць выкладчыку А. Т. Федаруку, студэнтцы V курса Т. Дзярабінай, студэнту І курса В. Сасу.

**Л. МІЦІНА.**

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ём — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2000 экз.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 11051

Зак. 323.